# ЭКОЛАГ, КРАЯЗНАЎЦА, ПАТРЫЁТ – АНАТОЛЬ МАКСІМАВІЧ ДАРАФЕЕЎ

***М.В. Півавар***
ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Беларусь, e-mail: pivavar@gmail.com

Імя Анатоля Максімавіча Дарафеева ўжо належыць гісторыі. Яно ўвайшло ў гісторыю не 30 ліпеня 2010 г., калі перастала біцца ягонае сэрца, але значна раней. Дасягнуўшы ў сваёй кар'еры вельмі высокіх вышынь – старшыня Дзяржкамітэта РБ па экалогіі (1990–1994), першы міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя РБ (1994), першы прарэктар ВДУ ім. П.М. Машэрава (1994–2002), загадчык кафедры экалогіі і аховы прыроды гэтага ж універсітэта (2002–2010).

Ганаровы член педагагічнага таварыства РБ, Ганаровы член Беларускага таварыства аховы прыроды (1979, 1991), Ганаровы член ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" (2000). Кандыдат біялагічных навук (1972), дацэнт (1973), акадэмік-заснавальнік Міжнароднай акадэміі экалогіі (1992), правадзейны член Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі (1994), член-карэспандэнт Пятроўскай Акадэміі навук і мастацтваў (1994), член-карэспандэнт Беларускай інжынернай акадэміі (1994), правадзейны член Маскоўскага таварыства выпрабавальнікаў прыроды, РГТ.

Не гледзячы на ўсе пералічаныя званні і пасады А.М. Дарафееў заўсёды заставаўся патрыётам сваёй малой радзімы – Гарадоччыны, Віцебшчыны, знаходзячы час на яе вывучэнне. Сённяшні даклад прысвечаны не Дарафееву біёлагу, а краязнаўцу.

Краязнаўчую дзейнасць А.М. Дарафееў распачаў будучы студэнтам пядінстытута. Вялікі ўплыў на фарміраванне поглядаў і цікавасці да краязнаўчых даследаванняў аказаў загадчык кафедры заалогіі ВДПІ імя С.М. Кірава Анатоль Іванавіч Радкевіч [1]. А.М. Дарафеў праводзіў комплекснае вывучэнне Віцебшчыны, але перадусім ён аддаваў перавагу прыродазнаўчаму, літаратурнаму і гістарычнаму краязнаўству.

Яшчэ ў 1970–80-я гады даследчык актыўна ўдзельнічаў у працы Віцебскага абласнога аддзялення таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Калі пры будаўніцтве аб'ездной дарогі Віцебск – Ленінград дарожнікі збіраліся знішчыць унікальны помнік археалогіі гарадзішча "Буракова" у Гарадоцкім раёне, менавіта дзякуючы яго актыўным намаганням помнік, хоць і ў пашкоджаным стане быў захаваны для нашчадкаў.

Прыродазнаўчае (экалагічнае) краязнаўства – даследаванне наземных пазваночных Беларускага Паазер'я (фауна, экалогія, выкарыстанне, ахова) з'яўляліся найбольш улюбёнай тэмай навукоўцы. Матэрыялы шматгадовых даследаванняў былі пакладзены ў аснову артыкулаў для Чырвонай кнігі БССР (I–II выданні). Першая мая суст-



Репозиторий ВГУ

рэча з Анатолем Максімавічам як раз была звязана з ёю і адбылася на паверсе біялагічнага факультэта, дакладней перад стэндам з раслінамі, занесенымі ў Чырвоную кнігу Беларусі, дзе я пытаўся вызначыць экземпляр кураслепа ляснога. Верагодан, іншы выкладчык мог бы прайсці міма, але Анатоль Максімавіч звярнуў увагу на маладога чалавека, які цікавіцца рэдкімі раслінамі. З размовы вызначылася, што мною была знойдзена новая, дагэтуль невядомая папуляцыя ў Браслаўскім раёне, якую трэба ўключыць у новае выданне Чырвонай кнігі, рэдактарам якой ён і з'яўляўся.

Не схлушу, што менавіта такое стаўленне да простага чалавека першага прарэктара ўніверсітэта, цікавасць да ягоных знаходак падштурхнулі мяне да далейшай дзейнасці на ніве прыродазнаўчага краязнаўства. Потым была дапамога ў працы па афармленні дакументаў па самая вялікай хвоі на Беларусі, якая была знойдзена каля в. Сушчова. Былі яшчэ новыя месцы вырастання шпажніка царапіцавага, рагулькаў высокіх, пярэсны еўрапейскай. Наша супольная праца па выяўленні помнікаў прыроды была паспяховай. Па парадах А.М. Дарафеева мы з гурткоўцамі Лужаснянскай гімназіі правялі вывучэнне святой крыніцы ў в. Жукава Гарадоцкага раёна, валуноў, заказнікаў у Гарадоцкім, Віцебскім раёнах. З атрыманай методыкай пры працягвалі працаваць і без парад. Цяпер можна казаць пра дзесяткі аб'ектаў, выяўленых самастойна.

З парады А.М. Дарафеева я, разам з гімназістамі правялі экспедыцыю па месцу выяўлення *Гарцаслава* – невядомага горада, які існаваў на Гарадоччыне ў XVI–XVII ст. На аснове тапанімічных звестак, легендаў і паданняў, аналізу археалагічнай інфармацыі Дарафееў зрабіў меркаванне, што горад існаваў каля в. Вокшына Гарадоцкага раёна. На карысць версіі сведчаць роўная пляцоўка на гарадзішчы, якое магло быць замчышчам, блізасць да ключавых у мінулым гарадзішчаў – Буракова, Новаболецкага, гара Маёўка, вёскі з назвамі Шляхта, Баяры. На мяркуемым месцы пры правялі шурфоўку, але культурнага слою не выявілі, што аднак магчыма, бо тэрмін існавання горада зусім невялікі.

У рэшце, менавіта Анатоль Максімавіч убачыўшы доўгатэрміновыя вынікі працы прапанаваў паступаць ў аспірантуру, а калі ў гэтым было адмоўлена, ён асабіста, разам са мной пайшоў у аддзел аспірантуры і дамогся, каб я быў залічаны суіскальнікам. Даведка аб залічэнні з ягоным подпісам як прарэктара па навуковай частцы і цяпер захоўваецца ў маім асабістым архіве.

На роднай Дарафееву Гарадоччыне побач беларусамі пражывалі латышы. Вучоны актыўна даследаваў гісторыю іх перасялення і ролю ў жыцці Віцебшчыны. Шмат хутароў было на Гарадоччыне. Ягоны даклад на канферэнцыі "Разам на працягу стагоддзяў" (беларуска-латышскія ўзаемадачыненні ў Дзвінскім рэгіёне)" (лістапад 2006 г.) быў узорным, па

ўзроўню ведання лакальнай гісторыі нацыянальнай меншасці ў пэўным рэгіёне [2]. Будынак школы, пабудаванай каланістамі ў в. Паташня захаваўся да нашых дзён. І цяпер тут варта было б зрабіць назіральны пункт арнітолагаў, назваць яго ў гонар даследчыка.

Усе даследаванні А.М. Дарафеева грунтаваліся на высокім навуковым узроўні. Будучы біёлагам, ён актыўна і вельмі ўмела выкарыстоўваў дадзеныя архіўных матэрыялаў. Лекцыя па выкарыстанні архіваў у вывучэнні прыроды, якую ён прачытаў канферэнцыі “150 гадоў А.П. Сапунову” магла бы стаць узорнай для любога гісторыка. На ёй ён распавядаў аб мурашніку, які, на ягоную думку з’яўляўся самым вялікім у Еўропе. Час ягонай гібелі ён вызначыў у выніку вывучэння фондаў Гарадоцкага лясгаса, пажарнай аховы.

А.М. Дарафееў выступаў актыўным арганізатарам справы па мемарыялізацыі мясцін, звязаных з жыццём і дзейнасцю выдатных землякоў – Я. Баршчэўскага, К. Вераніцына, Я. Драздовіча, П.М. Машэрава і інш. З мэтай папулярызацыі іх дзейнасці, актывізацыі вывучэння іх ролі ў гісторыі і культуры Беларусі А.М. Драфееў стаў ініцыятарам і арганізатарам правядзення літаратурна-краязнаўчых і навуковых міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных канферэнцый і чытанняў прысвечаных. Я. Баршчэўскаму [3], літаратурна-краязнаўчых чытанняў “Паэма “Тарас на Парнасе”: здабыткі і праблемы” (1997, 1998, 2001, 2003, 2004) [4]. З мэтай падрыхтоўкі больш грунтоўных даследаванняў Дарафееў выступіў як арганізатар правядзення шматлікіх прыродалітаратурна-краязнаўчых экспедыцый па Віцебшчыне. Напрыклад, у в. Мурагі Расонскага раёна, на радзіму Я. Баршчэўскага, у в. Астраўляны Гарадоцкага раёна – на радзіму К. Вераніцына.

Новым крокам стала падрыхтоўка, арганізацыя і правядзенне па ягонай ініцыятыве ў 2007 г. “Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў” і іншых мерапрыемстваў. Кожная канферэнцыя абавязкова праводзілася з выездам у цікавыя і знакавыя месцы Гарадоччыны: гарадзішча Вышадкі, урочышча “Прыстань” і іншыя. Менавіта ў час наведвання апошняга, якое знаходзіцца непадалёк ад в. Кісялі ўдзельнікам канферэнцыі была паказана цікавая геалагічная з’ява – марэнная града на мяжы Гарадоцкага ўзвышшча і Полацкай нізіны. На марэне была наведана гарадзішча ранняга жалезнага века, а на мясцовых могілках – магіла палкоўніка Аляксея Карпава – удзельніка вайны 1812 г. чыё жыццё, а таксама ягоных нашчадкаў – вельмі паважаных людзей у краі, стала прадметам вывучэння А.М. Дарафеева. Ягоны унук – Уладзімір Мікалаевіч, быў не меней славутым, быў актыўным рэфарматарам сялянскага жыцця, яалавекам прагрэсіўных поглядаў, падзяляў вучэнне Льва Талстога. За ягоную дабрыню і добразычлівае стаўленне настолькі паважалі мясцовыя сяляне, што ў 1920-я гады, калі яго прыехалі арыштоўваць, сяляне не дазволілі гэтага зрабіць, а калі ўсё ж такі энтузіяст быў зняволены ў Віцебску, то сяляне



Репозиторий ВГУ

прыйшлі ў горад, каб заступіцца за паважанага чалавека. Так, ён па тэлефоннай кнізе адшукаў нашчадкаў палкоўніка.

Асобна Дарафееў вывучаў лёсы выдатных выпрабавальнікаў (натуралістаў)-віцяблян: Я.К. Мароза, У. Адамава, У.А. Плюшчэўскага-Плюшчыка і ягонай калекцыі. Адносна апошняй, пасля сур'ёзных даследаванняў ён выказваў меркаванне, што яна захавалася і знаходзіцца верагодней за ўсё дзесьці ў Аўстрыі.

Адным з накірункаў дзейнасці выдатнага навукоўцы стала дапамога ў стварэнні экспазіцый аддзелаў прыроды і этнаграфіі ў розных музеях краіны, у тым ліку ў Гарадоцкага, Расонскага, Полацкага краязнаўчых музеяў. Раздзел прыроды ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі быў распрацаваны з улікам ягоных парад. Узровень ягонай эрудыцыі, прафесіянальнай кампетэнцыі быў настолькі высокім, што галоўная захавальніца фондаў ВАКМа А.А. Букіна лічыла яго сваім настаўнікам у краязнаўстве. Шэраг матэрыялаў (кнігі, копіі артыкулаў, некаторыя калекцыі і інш.) перадаў у ВАКМ, Гарадоцкаму раённаму, Лепельскаму, Полацкаму, Расонскаму краязнаўчым музеям, экалагічнаму музею Краснапольскай СШ Расонскага раёна. У пэўнай ступені вынікам краязнаўчага вывучэння краю, якая праводзілася А.М. Дарафеевым стала арганізацыя ландшафтных, паляўнічых, батанічных заказнікаў на Беларусі і Віцебшчыне ў прыватнасці: “Дымаўшчына”, “Прыдзвінне”, “Чортава барада” і іншыя заказнікі ў наваколлях Віцебска.

Сітуацыя з уганараваннем Анатоля Максімавіча неадназначная. З аднаго боку ягоная праца адзначана Граматай ВС БССР (1982), нагрудным знакам “За выдатныя поспехі ў рабоце Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР” (1979), сярэбраным медалём ВДНГ СССР (1988), памятным медалём Геаграфічнага таварыства “У гонар 100-годдзя акад. Я.П. Паўлоўскага” (1985), 2 медалямі МВА СССР “За поспехі ў арганізацыі навуковай работы студэнтаў” (1977, 1990). Выдатнік асветы СССР (1984), выдатнік вышэйшай школы СССР, выдатнік народнай асветы БССР (1988). З другога боку, усе ўзнагароды былі атрыманы ў 1970–1990-я гг., за выключэннем медаля “За працоўныя заслугі” (2001). На маю думку, ён быў варты большага

Навуковая спадчына А.М. Дарафеева вялікая. Ён – аўтар больш 150 навуковых прац па арніталогіі, ахове прыроды і методыцы выкладання заалогіі, у тым ліку 7 кніг, адказны рэдактар і ўкладальнік 10 зборнікаў, 2 прэс-рэлізаў. Як краязнаўца, ён з'яўляецца аўтарам некалькіх артыкулаў у кнізе “Памяць” Гарадоцкага раёну [5]. Аўтар-укладальнік і рэдактар зборніка “Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра” [6]. У кнізе “Віцебскі раён. Краязнаўчыя нарысы” 1н быў рэдактарам І раздзела, прысвечанага прародзе краю.У мясцовым і рэспубліканскім друку змяшчаліся шматлікія артыкулы прысвечаных экалогіі, гісторыі і культуры Віцебшчыны.

Рэпазіторый ВДУ

Асаблівую каштоўнасць маюць больш 120 сшыткаў дзённікавых запісаў. У рукапісах знаходзяцца дзённікі экалагічных назіранняў (1959–2009), "Акварэлі прыроды" (12 кніжак нарысаў аб прыродзе). Хатні бібліятэчны збор змяшчае больш 5 тысяч тамоў.

Апісанне і аналіз краязнаўчай спадчыны выдатнага даследчыка Паазер'я наперадзе. Пакуль невялікі артыкул пра яго маецца ў даведніку "Краязнаўцы Віцебшчыны" [7], кнізе "Памяць" [8], а таксама ў некаторых артыкулах у рэспубліканскім і мясцовым перыядычны друку [9]. Думаецца, што сённяшняя канферэнцыя пакладзе пачатак новаму этапу ў вывучэнні спадчыны вядомага навукоўцы, краязнаўцы і патрыёта краіны і Віцебшчыны.

## Літаратура


1. Вартаўнік прыроды [Радкевіч У.А.] // ВР. – 1986. – № 130. – С. 47.
2. Латыши на Городокщине // Беларусь і Латвія: адміністрацыйнае, сацыянальна-эканамічнае і культурнае ўзаемадзеянне ў Дзвінскім рэгіёне: матэрыялы Міжнар. навук. канф "Разам на працягу стагоддзяў (беларуска-латышскія ўзаемадачыненні ў Дзвінскім рэгіёне)", Віцебск, 14–15 ліст., 2006 г. / пад рэд. Л. Хмяльніцкай. – Мн: Тонпік, 2006. – С. 84–101.
3. Ян Баршчэўскі: дыялог з часам і ў часе. Матэрыялы ІІІ міжнародных чытанняў 15–16 снежня. г. Віцебск. – Віцебск: ВДУ ім. П.М. Машэрава. 2002. – 116 с.
4. Паэма "Тарас на Парнасе": здабыткі і праблемы. Матэрыялы другіх літаратурна-краязнаўчых чытанняў, г. Гарадок, 1999 г. . – Гарадок: самвыдат, 1999. – 48 с.
5. Язэп Драздовіч на Гарадоччыне // Памяць: Гарадоцкі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў / Укл. С.У. Садоўская. Мн.: Беларусь, 2004. – С. 164–165; Гарадоцкая старонка з жыцця пісьменніка А. Пшчолкі // Тамсама. – С. 215–218; Палкоўнік артылерыі Каразееў Г.П. // Тамсама. – С. 416–417.
6. Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра. Матэрыялы І Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў. 28 кастрычніка 2007 г. / Гарадоцкі кр. музей; А.М. Дарафееў (адк. рэдактар) [і інш.]. – Гарадок, 2008. – 151 с.
7. Дарафееў Анатоль Максімавіч // Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; уклад. М. В. Піваварю – Мінск: Паркус плюс, 2008. – С. 94–95.
8. Дарафееў Анатолій Максімавіч // Памяць : Гарадоцкі р-н : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. С.І. Садоўская; рэдкал. Н.А. Бурунова [і інш.]. – Мн., 2004. – С. 711.
9. Аўсіевіч М. Анатоль Дарафеенка: Сусветны вопыт – здабытак агульны // РП. – 1992. – № 11–12. – С. 2–3; Казаннікаў А. А.М. Дарафееў: Выхаваць экалагічную культуру // РП. – 1993. – № 3. – С. 8–9; Дарафееў А.М. \\ Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава : Падзеі. Людзі. Лёсы \ Пад рэд. А.У. Русецкага, А.М. Дарафеева. – Віцебск: ВДУ, 1998. – С. 98; Шпакоўская Г. "Птушка шчасця жыве на Беларусі" // ГВ. – 2001. – № 98. – С. 3; Птушка шчасця жыве ў Беларусі [Дарафееў А.М.] // НС. – 2001. – № 137. – С. 5.


Репозиторий ВГУ